

НАЙЛЕПШЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ, ЗБІРАЮЧЫСЯ Ў ЛЕС 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 71 (30205)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КОРАТКА

- На вугальны разрэз «Распадскі» (Расія) адгружана 23 новыя самазвалы БелАЗ.
- Дзецям пры неўралагічных парушэннях, сутаргавым сіндроме, эпілепсіі ў анамнезе не рэкамендуецца катацца на атракцыёнах.
- Атракцыёны ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага, парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў і парку імя 900-годдзя Мінска запрацуюць 26 красавіка.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ГІГІН, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:**

*«У нас здаровая грамадзянская супольнасць. Мы гэтае паняцце ачысцілі ад такіх напластаванняў, не ўласцівых яму, якія часта з Захаду прыходзілі, дзе грамадзянскую супольнасць разглядаюць як інструмент маніпулявання палітычнай сістэмай. Мы ж, прыняўшы закон, увялі грамадзянскую супольнасць у прававое поле. І аказалася, што ў нас магутныя арганізацыі, у нас даволі шмат грамадзянскіх ініцыятыў патрыятычнай, сацыяльнай скіраванасці. Людзі гатовы самааб'ядноўвацца, і дзяржава гэта падтрымлівае. Адно толькі патрабаванне — дзейнічаць у рамках закона. І ў развіццё гэтага, вядома ж, ніякага замежнага ўплыву быць не можа. Калі мы выконваем гэтыя правілы, калі мы дзейнічаем у інтарэсах людзей, то ёсць вынік».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПРАЕКТЫ ПА ДАСЯГНЕННІ ТЭХНАЛАГІЧНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ ПАВІННЫ СТАЦЬ МАТОРАМ АБНАЎЛЕННЯ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ»

## Як павінна развівацца беларуская прамысловасць на ўзроўні тактыкі і стратэгіі

**Канструктыўная, грунтоўная і прынцыповая размова на найважнейшую тэму прайшла ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную стану і задачам прамысловасці краіны. Гэту нараду кіраўнік дзяржавы анансаваў яшчэ ў студзені падчас наведвання завода «БЕЛДЖЫ». Тады ён падкрэсліваў неабходнасць разгледзець вынікі работы арганізацый прамысловасці. За амаль тры месяцы Прэзідэнт неаднойчы пераносіў гэту нараду, каб узбуйніць састаў і разгледзець усе праблемы і перспектывы айчыннай прамысловасці. У выніку ў Палацы Незалежнасці сабралася больш чым 250 чалавек, сярод якіх вышэйшыя службовыя асобы, члены ўрада, губернатары, кіраўнікі прадпрыемстваў, навукоўцы і іншыя адказныя асобы. У такім складзе абмеркаванне атрымалася надзвычай плённым і працягвалася амаль чатыры гадзіны.**



Фота БелТА.

На пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што па выніках мінулага года ўжо праведзены шэраг вялікіх нарад. І яны яшчэ будуць праводзіцца ў іншых сферах. Прэзідэнт адзначыў, што на нарадзе па прамысловасці неабходна абмеркаваць перспектывы айчыннай прамысловасці і пытанні якасці прадукцыі. Ужо зроблены пэўныя крокі. На некаторыя ключавыя пазіцыі прыйшлі ўжо новыя людзі, і прыняты шэраг рашэнняў. «Цяпер трэба абмеркаваць, як будзем рухацца далей. І на ўзроўні стратэгіі, і на ўзроўні тактыкі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён акрэсліў блокі пытанняў, на якія варта звярнуць асаблівую ўвагу.

### Першае. Вытворчасць

«Урад дакладвае, што ў цэлым Мінпрамаў апошнія некалькі гадоў забяспечваецца стабільны рост аб'ёмаў вытворчасці. За тры гады прыраслі амаль на 40 працэнтаў. Ёсць вынік і ў мінулым годзе. Прамысловай прадукцыі выраблена амаль на 30 мільярдаў рублёў, тэмп росту — амаль 113 працэнтаў. Назіраецца значнае павелічэнне выпуску электронікі, легкавых і грузавых аўтамабіляў, камбайнаў. «Планар», «ІНТЭГРАЛ» і «БелОМА» поўнасцю сфарміравалі партфель экспартных заказаў на бягучы год і часткова на 2025-ы, — пералічыў Прэзідэнт. — Але што з іншымі прамысловымі гігантамі? Чаму скараціліся аб'ёмы выпуску халадзільнікаў, трактароў, пагрузчыкаў, рухавікоў?»

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што больш чым на чвэрць прасеў «Бабруйскаграмаш». Толькі на 12 працэнтаў у 2023 годзе быў загружаны Мінскі падшыпнікавы завод. Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі маецца шматгадовы досвед працы ў станкабудаванні — найважнейшай галіне ў любой індустрыяльнай эканоміцы.

«А якая сітуацыя тут сёння? Дзе выкарыстанне сучасных тэхналогій, такіх як штучны інтэлект, рабатызацыя? А менавіта яны забяспечваюць высокую дакладнасць і прадукцыйнасць у апрацоўцы матэрыялаў, эканомію рэсурсаў, зніжэнне затрат і якасць прадукцыі. Усяго гэтага няма. Але што самае сумнае — няма бачання перспектывы. Чакаю ад вас канкрэтных прапаноў, як будзем выпраўляць сітуацыю», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Прыярытэты

# СТАЎКА НА КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

**У нашай краіне выяўлена 12 тысяч радовішчаў карысных выкапняў, з іх 1300 падрыхтавана для прамысловай вытворчасці. Геолагаразведачныя работы для пошуку новых радовішчаў вядуцца ў Беларусі ўжо досыць даўно. Гэтая дзейнасць важная для павышэння эканамічнага патэнцыялу краіны, а таксама для папаўнення мінеральна-сыравіннай базы краіны.**

Як вядома, асноўныя работы па павышэнні геалагічнай вывучанасці тэрыторыі, нарошчванні мінеральна-сыравіннай базы краіны, удасканаленні тэхналогій здабычы і перапрацоўкі сыравіны вядуцца па Дзяржаўнай праграме «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2021—2025 гады. Пра перспектывы здабычы карысных выкапняў у нашай краіне расказала **кансультант упраўлення па геалогіі Галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Марыя ШАСТАК.**

### Калійныя солі выйшлі ў «плюс»

У параўнанні з цяжкім 2022 годам летась здабыча калійных солей вырасла ажно на 70 %. Гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы паспяховаму развіццю лагістыкі нашых паставак мінеральных угнаенняў за мяжу. Вырасла здабыча пяску для шкла на 15 %, будаўнічага каменя — на 13 % і абліцовачнага — на 1 %. Гэта дазваляе зніжаць імпарт мінеральнай сыравіны.

СТАР. 4

Соцыум

# ПАМЯТАЕМ, ШАНУЕМ, КЛАПОЦІМСЯ

## Да Дня Перамогі ветэраны атрымаюць значную матэрыяльную дапамогу

**У Беларусі жыве каля 1100 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх узрост набліжаецца да 100 гадоў, а некаторыя яго перасягнулі.**

СТАР. 5




Фота БелТА.